**УДК 340.12«15/16»**

# РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА ЎДАСКАНАЛЕННІ ПАЛІТЫКА-ПРАВАВОЙ СІСТЭМЫ Ў ТВОРАХ АНДРЭЯ ВОЛАНА

***канд. філас. навук, дац. І.А. БОРТНІК, А.А. ЕМЯЛЬЯНАЎ***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Даследуюцца праекты-рэкамендацыі, змешчаныя ў творах выбітнага прадстаўніка грамадска-палітычнай думкі Вялікага Княства Літоўскага XVI ст. Андрэя Волана, накіраваныя на ўдасканаленне існуючай у Рэчы Паспалітай палітыка-прававой сістэмы. Адзначаецца станоўчае ў цэлым стаўленне А. Волана да сучаснай яму палітыка-прававой сістэмы Вялікага Княства Літоўскага і Польскага Каралеўства пры адначасовай крытыцы шэрагу яе канкрэтных з'яў. Шлях выкаранення недахопаў існуючай сістэмы бачыўся А. Воланам праз правядзенне адпаведных прававых рэформ дзяржаўнымі органамі ўлады, а таксама павышэнне адукацыйнага і маральнага ўзроўню асоб, якія з'яўляюцца адказнымі за функцыянаванне палітыка-прававога ладу. Аналізуюцца вылучаныя ў творах А. Волана рэкамендацыі па ўдасканаленні агульных асноў прававой сістэмы, рэкамендацыі па ўдасканаленні дзяржаўна-палітычнай сістэмы, міжстанавых адносін, канкрэтных прававых норм.*

**Уводзіны.** Другая палова XVI – пачатак XVII стст. – гэта час актывізацыі грамадска-палітычнага жыцця і правядзення рэформ у сферы дзяржаўнага ладу, заканадаўства, адміністрацыйнай і судовай сістэм, якія амаль на два стагоддзі вызначылі спецыфіку сацыяльна-палітычнай мадэлі, рэалізаванай у Вялікім Княстве Літоўскім, якое ў гэты час увайшло ў склад Рэчы Паспалітай. Дадзеныя працэсы суправаджаліся ўздымам грамадска-палітычнай думкі, у межах якой знаходзілі тэарэтычнае адлюстраванне характэрныя асаблівасці сацыяльна-палітычнага жыцця і рэфарматарскай дзяржаўнай дзейнасці ў разглядаемы час. Адным з найбольш выбітных прадстаўнікоў грамадска-палітычнай думкі ВКЛ другой паловы XVI – пачатку XVII стст. з'яўляўся прадстаўнік адукаванай палітычнай эліты, дзяржаўны і рэлігійны дзеяч Андрэй Волан (1530–1610).

Аб'ектам даследавання ў межах дадзенага артыкула выступаюць працы А. Волана, прысвечаныя грамадска-палітычнай тэматыцы: "Аб грамадзянскай, або палітычнай свабодзе" (1572) [1], "Прамова да Сената Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага" (1573) [2], "Пра дзяржаўнага мужа і яго асабістыя дабрачыннасці" (1608) [3]. Прадметам даследавання выступаюць ідэі рэкамендацыйнага характару, змешчаныя ў дадзеных творах адносна перспектыў рэфармавання палітыка-прававой сістэмы ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Адпаведна мэта артыкула – выяўленне і характарыстыка рэкамендацый па ўдасканаленні палітычнага і прававога ладу ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай, якія ўтрымліваюцца ў вышэйназваных творах А. Волана, перадусім у працы "Аб грамадзянскай, або палітычнай свабодзе".

Творчасць Андрэя Волана дастаткова добра даследавана ў польскай, беларускай і літоўскай навуковай літаратуры. Сярод вядомых даследаванняў, якія з'явіліся ў XX ст., можна вылучыць працы Э. Ярра, А. Кэмпфі, С.Ф. Сокала, С.А. Падокшына [3-8]. У гэтай сувязі можна асобна вызначыць унёсак у аналіз сацыяльна-палітычнай канцэпцыі А. Волана, зроблены беларускімі даследчыкамі С.Ф. Сокалам і С.А. Падокшыным, якія грунтоўна і шматгранна ахарактарызавалі яе асноўныя элементы. Пераважнае месца ў іх даследаваннях надаецца агульнатэарэтычным праблемам у творах А. Волана. Практычная скіраванасць гэтых твораў таксама адзначаецца. Так, С.Ф. Сокал указваў на ідэі А. Волана аб неабходнасці гуманізацыі дзяржаўнага права і яго набліжэння да патрабаванняў натуральнага права, аб падрыхтоўцы адукаваных і кампетэнтных суддзяў [7, с. 90–98]. С.А. Падокшын у сваім даследаванні "Філасофская думка Беларусі эпохі Адраджэння" сфармуляваў асноўныя элементы праграмы рэформ грамадска-палітычнага ладу ВКЛ, якая ўключала ў сябе патрабаванні рэфармавання органаў дзяржаўна-адміністрацыйнай улады і суда, заканадаўства, стварэння гарантый для абароны маёмасных і асабістых правоў станаў, паслабленне асабістай залежнасці сялян ад шляхты, развіццё рамяства і гандлю [9, с. 205]. С.А. Падокшын зрабіў выснову аб наяўнасці ў канцэпцыі А. Волана элементаў раннебуржуазнага юрыдычнага светапогляду. На яго думку, А. Волан з'яўляўся выразнікам інтарэсаў адукаванай і гуманістычна настроенай шляхты, якая імкнулася да рэфармавання заканадаўства і дзяржаўных інстытутаў у ВКЛ (мелася на ўвазе кола паплечнікаў полацкага ваяводы Мікалая Дарагастайскага, якое ініцыіравала рэформы заканадаўства і суда ў ВКЛ у 1580-я гг.). Але пры гэтым адзначалася, што ў некаторых выпадках, напрыклад, пры разглядзе канкрэтных пытанняў права ў воланаўскай канцэпцыі праяўлялася дэмакратычная тэндэнцыя да прызнання прыярытэту агульначалавечых каштоўнасцяў [9, с. 215, 221, 226]. Разам з тым падрабязнага аналізу канкрэтных палітыка-прававых рэкамендацый у твсрох А. Волана праведзена не было. Таксама неабходна адзначыць, што на працы як С.Ф. Сокала, так і С.А. Падокшына вялікі адбітак мела пануючая ў савецкія часы марксісцка-ленінская метадалогія.

У позніх працах С. Падокшына, змешчаных у зборніку “Беларуская думка ў кантэксце гісторыі і культуры”, мела месца спроба пераасэнсавання творчасці А. Волана з новых пазіцый. Вялікае значэнне мелі ўвядзенне ў навуковы зварот і аналіз працы “Прамова да Сената” [8, с. 167–173]. Але разам з тым адыход ад марксісцка-ленінскай метадалогіі суправаджаўся неабгрунтаваным выкарыстаннем мадэрнісцкай трактоўкі творчай спадчыны А. Волана, гэтаксама як і іншых прадстаўнікоў грамадска-палітычнай думкі ВКЛ XVI–XVII стст. Ідэі А. Волана разглядаюцца або як праява ліберальна-дэмакратычнай традыцыі ў сацыяльна-палітычнай думцы ВКЛ, як тэарэтычныя выток ліберальнай дэмакратыі XVIII ст. [8, с. 149], або як “прагрэсіўны шляхецкі неакансерватызм” [10, с. 169].

У цэлым можна адзначыць адсутнасць у навуковай літаратуры сістэмнага аналізу і выяўлення асноўных практычных рэкамендацый па ўдасканаленні палітыка-прававой сістэмы ў творах А. Волана.

**Асноўная частка.** У сістэме сацыяльна-палітычных поглядаў А. Волана вялікае значэнне надаецца праву. Дзяржаўнае права разглядаецца як форма рэалізацыі натуральнага права. Галоўнай яго мэтай абвяшчаецца забеспячэнне грамадзянскай свабоды, пад чым разумеецца стварэнне гарантый недатыкальнасці асобы і яе ўласнасці [1, с. 19–21, 26]. Але дасягненне дадзенай мэты магчымае толькі там, дзе дзяржаўнае права адпавядае важнейшым этыка-палітычным каштоўнасцям, што вынікаюць з натуральнага розуму – дабру, справядлівасці, памяркоўнасці, прынцыпу згоды [1, с. 26–28, 32]. У адпаведнасці з гэтым удасканальванне заканадаўства на аснове яго набліжэння да ідэальнай мадэлі натуральнага права складае галоўную лінію разважанняў А. Волана ў кантэксце перспектыў рэфармавання палітыка-прававой сістэмы.

Ацэнка А. Воланам сучаснага яму дзяржаўна-палітычнага ладу ВКЛ і Рэчы Паспалітай мела супярэчлівы характар. З аднаго боку, агульныя асновы дадзенага ладу выклікаюць ухвалу. А. Волан з гонарам адзначае высокую ступень палітычнай свабоды, якая характэрная для Рэчы Паспалітай. Асабліва высока ацэньваюцца ім суверэнітэт палітычнага народа – шляхты ў справе абрання манарха (інстытут вольнай элекцыі) і ў справе прыняцця законаў (прынцып “нічога для нас без нас”) [1, с. 47–49].

У той жа час некаторыя канкрэтныя праявы функцыянавання дадзенай дзяржаўна-палітычнай сістэмы выклікаюць вострую крытыку. А. Волан адзначае, што ўключэнне ў актыўнае палітычнае жыццё шырокіх мас шляхты, якія не вызначаюцца належнай адукаванасцю і маральнасцю, кіруюцца не ідэаламі агульнага дабра, а сваімі прыватнымі эгаістычнымі інтарэсамі, часта мае адмоўныя палітычныя вынікі. Прыкладам гэтаму з’яўляецца арганізацыя вайсковай абароны. З аднаго боку, А. Волан станоўча адзначае наяўнасць прававых абмежаванняў для манарха ў справе абвяшчэння вайны, што дазваляе прадухіліць магчымасць уцягвання дзяржавы ў вайну з выключна асабістых амбіцый правіцеля. Але, з другога боку, ён канстатуе іншую крайнасць у гэтым пытанні, якая стала магчымай ва ўмовах шляхецкай дэмакратыі: “Шляхта, упадабаўшы бяздзейнасць і даўно адвыкшы ад вайны, не азываецца на заклікі караля, не бярэцца за зброю і тым самым дазваляе ворагу ўрывацца ў нашыя землі і пустошыць нашу радзіму агнём і мячом” [1, с. 49–50]. Завуаляваная крытыка дзеянняў шляхты ў якасці палітычнага суб’екта назіраецца таксама пры разглядзе выбараў земскіх суддзяў, якія, паводле слоў А. Волана, не прадугледжваюць ніякай працэдуры і ў якіх рашаючую ролю маюць выкрыкі з натоўпу [1, с. 98]. Зрэшты, недастатковая адукаванасць і маральнасць, эгаізм і грэбаванне грамадскімі інтарэсамі адзначаюцца не толькі ў дзеяннях шляхты, але і ў дзеяннях манарха і вышэйшых дзяржаўных ураднікаў. Таксама А. Волан крытычна разглядае многія сучасныя яму сацыяльныя з’явы: распаўсюджанне сярод шляхты спажывецкіх каштоўнасцяў і звязанае з ім уцягванне шляхецкіх гаспадарак у таварна-грашовыя адносіны, узмацненне феадальнай эксплуатацыі сялянства, шырокае распаўсюджанне канфліктаў і крымінальных паводзін, перадусім у шляхецкім асяроддзі, карумпаванасць апарату дзяржаўнай улады, неэфектыўнасць судоў і г.д. Прычыны гэтых з’яў углядаюцца ў недасканаласці дзяржаўнага права і ў недасканалай маральна-прававой свядомасці грамадства, на што ўказваў С.А. Падокшын [9, с. 212, 218].

Адпаведна, рэфармаванне права разглядаецца А. Воланам як ключ для вырашэння грамадскіх праблем. У межах рэкамендацый адносна шляхоў дадзенага рэфармавання можна вылучыць наступныя элементы:

– рэкамендацыі па ўдасканаленні агульных асноў прававой сістэмы;
– рэкамендацыі па ўдасканаленні дзяржаўна-палітычнай сістэмы;
– рэкамендацыі па ўдасканаленні міжстанавых адносін;
– рэкамендацыі па ўдасканаленні канкрэтных прававых норм.

Рэкамендацыі па ўдасканаленні агульных асноў прававой сістэмы былі даволі грунтоўна даследаваны С.А. Падокшыным, якім былі пастуліраваны стыхійна-дыялектычнае разуменне А. Воланам права, наяўнасць моцнай гуманістычна-дэмакратычнай тэндэнцыі пры разглядзе праблем суадносін агульнага і адзінкавага ў праве, а таксама верыфікацыі, інтэрпрэтацыі і рэалізацыі закона. Пры гэтым адзначалася ўключанасць прававога мыслення А. Волана ў агульны кантэкст рэнесансна-гуманістычнай думкі, рэнесансная рэцэпцыя платонаўскай ідэі аб сінтэзе палітыкі і філасофіі [9, с. 215–221]. Вынікі даследавання

С.А. Падокшына па гэтым пытанні не страцілі сваёй значнасці да гэтага часу, хаця патрабуюць пэўных удакладненняў.

У аснове воланаўскай канцэпцыі права, як ужо адзначалася, знаходзіцца прынцып адпаведнасці дзяржаўнага заканадаўства натуральнаму праву, перадусім прынцыпам дабра і справядлівасці. У сувязі з гэтым галоўную ролю мае не фармалістычная трактоўка законаў, а іх разуменне ў адпаведнасці з натуральным маральным розумам. Акрамя таго, А. Воланам адзначалася зменлівасць сацыяльнай рэчаіснасці, што не дае магчымасці адназначна кадыфікаваць яе ў межах прававых норм: “разнастайнасць чалавечых дзеянняў, нестабільнасць чалавечага жыцця, шматлікія асаблівасці рэчаў з’яўляюцца прычынай таго, што ніводная навука не можа ўстанавіць нешта простае, універсальнае, прыдатнае для ўсяго і ва ўсякі час” [1, с. 90]. Зыходзячы з гэтага, можна шляхам абагульнення воланаўскіх разважанняў вылучыць наступныя рэкамендацыі адносна ўдасканалення заканадаўства як сістэмы:

– Неабходнасць пастаяннага ўнясення дапаўненняў у заканадаўства ў адпаведнасці са зменамі ў грамадстве (“Бадай ніводзін закон не можа быць бездакорны цалкам. Час безупынку спараджае штосьць новае і патрабуе ўносіць у закон разумныя ўдакладненні” [1, с. 89]). У гэтай сувязі трэба адзначыць, што незадоўга да напісання працы “Аб грамадзянскай, або палітычнай свабодзе” быў прыняты другі Статут ВКЛ 1566 г. Але ў хуткім часе гэты звод законаў выявіў сваю недасканаласць, што паслужыла прычынай для распрацоўкі новай рэформы Статута, які быў зацверджаны ў 1588 г.

– Неабходнасць канкрэтнага, а не фармальнага падыходу да тлумачэння права (“Справядлівы ж суддзя канкрэтызуе прававую норму і выбірае тое, што стваральнік закона хацеў бы абазначыць, але не здолеў (…) Пры гэтым неабходна ўважліва прааналізаваць час, месца, асобу чалавека” [1, с. 90]). Галоўным крытэрыем тлумачэння права абвяшчаецца не літара закона, а яго сэнс, прадыктаваны патрабаваннямі маралі. С.А. Падокшын справядліва бачыць у гэтых патрабаваннях імкненне да гуманізацыі права [9, с. 219]. У гэтай сувязі можна прыгадаць цытаванне А. Воланам Цыцэрона, паводле якога “сапраўднае права, ці, (…) сапраўднае правасуддзе, нярэдка дзейсніцца не ў межах закона, а ў межах дабра і справядлівасці” [1, с. 91].

Рэкамендацыі А. Волана па ўдасканаленні дзяржаўна-палітычнай сістэмы базіраваліся на ідэальнай мадэлі дзяржавы, якая была, на думку мысліцеля, рэалізавана ў Венецыянскай Рэспубліцы, дзе “непасрэдна ўдзельнічаць у дзяржаўных справах могуць нямногія” [1, с. 99]. Найбольш выразна погляды А. Волана на перспектывы рэфармавання дзяржаўна-палітычнага ладу Рэчы Паспалітай выяўлены ў працы “Прамова да Сената”, створанай на аснове прамовы, агалошанай падчас бескаралеўя 1572–1573 гг. на агульным, як мяркуе С.А. Падокшын, пасяджэнні Сената і Пасольскай Ізбы. У гэтай працы падкрэслівалася дзяржаватворчая роля Сената, што канкрэтызавалася ў сцвярджэнні за ім адказнасці за дзейнасць і выхаванне караля. А. Волан прапаноўваў пашырыць правы сенатараў праводзіць прызначэнні на вышэйшыя пасады дзяржаўныхураднікаў, распараджацца каралеўскім скарбам, сачыць за прыстойным характарам прыватнага жыцця манарха. Таксама ён заклікаў сенатараў да рашучасці ў рэалізацыі сваіх правоў і недапушчальнасці паблажлівага стаўлення да манархаў, якія злоўжываюць сваёй уладай [2, с. 176–177]. У іншым артыкуле намі больш падрабязна разгледжаны палітычны ідэал А. Волана, у аснове якога знаходзіцца ідэя “змешанай манархіі” з арыстакратычным ухілам.

Асобна ў гэтым кантэксце выступае праблема арганізацыі судовай улады, якая займала значнае месца ў творах А. Волана. У гэтай сувязі варта ўзгадаць пра праект рэформы апеляцыйнага суда. І ў ВКЛ, і ў Польскім Каралеўстве ў той час, калі ствараўся твор “Аб грамадзянскай, або палітычнай свабодзе”, функцыю апеляцыйнай судовай улады выконваў кароль і вялікі князь. Але, на думку А. Волана, такая ўлада не была эфектыўнай, паколькі кароль як кіраўнік дзяржавы вымушаны выконваць шмат абавязкаў і не мае дастаткова часу на разгляд апеляцыйных спраў, у выніку чаго вырашэнне многіх судовых спраў зацягвалася. Гэта прыводзіла да ўзрастання стыхійнага прававога нігілізму ў грамадстве, пазасудовага вырашэння канфліктаў [1, с. 99–100]. Выйсце бачылася А. Воланам у стварэнні спецыяльнага самастойнага органа вышэйшай судовай улады ў асобных частках Рэчы Паспалітай. У якасці прыкладаў падобнага кшталту судоў указваліся парыжскі парламент у Францыі і канвенты ў іспанскіх правінцыях, склад і функцыі якіх падрабязна разгледжаны ў працы “Аб грамадзянскай, або палітычнай свабодзе” [1, с. 101–103].

На ўзор адзначаных замежных устаноў А. Волан прапанаваў стварэнне ў ВКЛ і Польскім Каралеўстве апеляцыйных судоў, якія б складаліся з выбраных прадстаўнікоў шляхты і прафесійных юрыстаў. Асобна ўказвалася на недапушчальнасць прыцягнення да працы гэтых органаў улады прадстаўнікоў каталіцкага духавенства [1, с. 104]. Патрэба стварэння новых апеляцыйных органаў улады тлумачылася наступным чынам: “Створаныя ўстановы далі б магчымасць і ашчадней траціць дзяржаўныя сродкі, і далучыць нічым не занятых спецыялістаў, глыбока абазнаных у пытаннях Божага і чалавечага права, да пачэснай, так неабходнай грамадству і дзяржаве дзейнасці” [1, с. 104]. Дадзеная прапанова А. Волана знайшла сваю рэалізацыю яшчэ пры яго жыцці. У 1578 г. быў створаны Каронны Трыбунал у якасці вышэйшай апеляцыйнай судовай інстанцыі ў Польскім Каралеўстве. У 1581 г. з

аналагічнымі функцыямі быў утвораны і ў 1582 г. пачаў дзейнічаць Трыбунал Вялікага Княства Літоўскага, які складаўся з суддзяў, штогод абіраемых шляхтай на павятовых дэпутацкіх сойміках (па два суддзі-дэпутаты ад павета або ваяводства, калі яно не падзялялася на паветы). Суддзямі маглі быць абраны шляхціцы-ураджэнцы ВКЛ, якія мелі ўласныя маёнткі і былі дасведчаныя ў заканадаўстве [10, с. 673].

Немалую ролю сярод рэкамендацый па ўдасканаленні права меў праект гарманізацыі міжстанавых адносін, які даволі грунтоўна разгледжаны ў навуковай літаратуры [7, с. 81–88; 9, с. 209–215]. У адпаведнасці з існуючай з часоў Сярэднявечча сацыяльна-палітычнай традыцыяй, А. Волан вылучае тры грамадскія станы – шляхту, мяшчанства і сялянства – і вызначае іх асноўныя сацыяльныя функцыі. Для шляхты галоўнай функцыяй абвяшчаецца вайсковая абарона дзяржавы, для мяшчанства – рамесная і гандлёвая дзейнасць, для сялянства – сельскагаспадарчая праца [1, с. 29–30]. Кожны стан выконвае свае строга вызначаныя абавязкі дзеля падтрымання агульнага дабра. С.А. Падокшын падкрэслівае тое, што А. Волан у адпаведнасці са сваімі пратэстанцкімі поглядамі не вылучаў у якасці асобнага стану духавенства, якое лічылася прывілеяваным станам у каталіцкай думцы [9, с. 209].

Разам з тым у творах А. Волана падкрэсліваўся грамадзянскі статус прадстаўнікоў усіх станаў. Нягледзячы на розныя прывілеі і функцыянальныя абавязкі, усе грамадзяне павінны мець роўныя правы ў тым, што датычыць адказнасці за выкананне законаў. А. Волан выступаў за забеспячэнне ў заканадаўстве і судовай практыцы ВКЛ адноснай фармальна-прававой роўнасці ўсіх грамадзян, дазвол прадстаўнікам ніжэйшых станаў падаваць скаргі на шляхту. Такая сістэма прававых узаемаадносін паміж станамі, на яго думку, існавала ў Венецыянскай Рэспубліцы [1, с. 34]. Можна пагадзіцца з С.А. Падокшыным, які лічыў што А. Волан быў прыхільнікам абмежаванай фармальна-прававой роўнасці прадстаўнікоў усіх станаў [9, с. 210–215].

Значная ўвага ў працы А. Волана “Аб грамадзянскай, або палітычнай свабодзе” надаецца вызначэнню прававых падстаў пануючага шляхецкага стану. Тут неабходна падкрэсліць, што ўсе замацаваныя за шляхтай правы і прывілеі лічыліся непахіснымі. А. Волан нават з гонарам заяўляе аб тым, што шляхта Рэчы Паспалітай вылучаецца найбольш прывілеяваным статусам у параўнанні з пануючымі станамі ў іншых дзяржавах, што акрэсліваюць адзначаны вышэй суверэнітэт у справе фарміравання дзяржаўнай улады і прыняцця законаў, а таксама поўная прыватная ўласнасць на зямлю [1, с. 47–48]. У даследаванні С.Ф. Сокала сцвярджалася, што А. Волан быў праціўнікам карпаратыўнай замкнёнасці шляхецкага стану і абараняў ідэю аб першаснай ролі асабістых заслуг у справе надання шляхецтва [7, с. 85–87]. Сапраўды, у працы “Аб грамадзянскай, або палітычнай свабодзе” падкрэсліваецца прынцып “Знатнымі не нараджаюцца, а становяцца” [1, с. 37]. Высока ацэньваецца той шляхецкі статус, які становіцца вынікам рэалізацыі асабістых інтэлектуальных і валявых намаганняў (шматразова ўзгадваецца прыклад старажытнарымскага палкаводца Марыя, які, будучы выхадцам з сацыяльных нізоў, дасягнуў значнага грамадскага аўтарытэту, дзякуючы сваім асабістым якасцям). У той жа час шляхецтва, атрыманае па спадчыне без высакароднасці, разглядаецца А. Воланам як бессэнсоўнае. Сама з’ява радавітага шляхецтва, аднак, не адмаўляецца; увага акцэнтуецца на неабходнасці маральна-інтэлектуальнага выхавання прадстаўнікоў шляхецкага стану [1, с. 35–40].

Вялікая ўвага ў творах А. Волана надаецца рэкамендацыям адносна ўдасканалення канкрэтных прававых норм. У працы “Аб грамадзянскай, або палітычнай свабодзе” аўтар патрабуе прыняцця законаў, якія б прадугледжвалі суровае пакаранне за забойства (смяротнае пакаранне), пралюбадзейства і п’янства (турэмнае зняволенне, штрафы, публічная ганьба), а таксама абмежаванне выкарыстання прадметаў раскошы. Асаблівую ўвагу заслугоўваюць разважанні А. Волана наконт законаў аб забойстве. Ён з жалем адзначае, што ў Рэчы Паспалітай праз недасканаласць заканадаўчай базы і судовай практыкі пашыранай з’явай становіцца беспакаранасць забойцаў або вельмі мяккія прысуды за падобныя цяжкія злачынствы. Гэта, на яго думку, правакуе новыя злачынствы такога кшталту. А. Волан акцэнтуе ўвагу на тым, што бяспека жыцця з’яўляецца найважнейшым фактарам забеспячэння грамадзянскай свабоды. А гэта ў сваю чаргу патрабуе суровых прававых санкцый у дачыненні да тых, хто робіць замах на чалавечае жыццё [1, с. 53–61]. Праектуемыя А. Воланам суровыя законы супраць п’янства і пралюбадзейства таксама разглядаюцца як сродак забеспячэння грамадскай бяспекі і супрацьдзеяння іншым злачынствам, якія ўзнікаюць на базе адзначаных амаральных з’яў [1, с. 62–75].

Цікавым з’яўляецца патрабаванне А. Волана аб прыняцці законаў, накіраваных супраць раскошы. Гэта выклікана адмоўным стаўленнем мысліцеля да распаўсюджання з’явы дэманстратыўнага спажывання і адпаведнай яму сацыяльнай псіхалогіі ў шляхецкіх колах. Дадзеная з’ява была выклікана ўцягваннем шляхецкіх гаспадарак у таварна-грашовыя адносіны. На думку А. Волана, яна з’яўляецца праявай заганных натуральных жарсцяў чалавека – прагнасці, карысталюбства, хцівасці, што супярэчыць такой натуральнай дабрадзейнасці, як справядлівасць, і якія, перарастаючы ў сквапнасць і прагу чужой

маёмасці, выклікаюць рост сацыяльнага партыкулярызму і нясуць пагрозу грамадскаму дабрабыту [1, с. 76–77]. Увага звяртаецца таксама на адмоўныя сацыяльна-эканамічныя вынікі прагі да раскошы: “Марнатраўства заўсёды адчувальна нішчыць дабрабыт асобнага чалавека, спараджае вялікую дарагавізну і харчоў, і адзення, кладзецца цяжкім гнётам на няшчасны люд” [1, с. 77]. Продаж у шырокіх маштабах збожжа за мяжу з мэтай набыцця прадметаў раскошы выклікае дэфіцыт хлеба на ўнутраным рынку і адпаведны рост коштаў на яго, што нярэдка становіцца прычынай голаду. А. Волан адзначае, што схільнасць эліты да празмернага багацця стала прычынай гібелі Рымскай, а потым і Візантыйскай імперыі, а таксама Венгерскага Каралеўства [1, с. 77–80]. З праведзенага аналізу ён рабіў выснову аб тым, што “грамадству надзвычай важна, каб ніхто не злоўжываў сваёю маёмасцю і каб кожны падпарадкоўваў свае жаданні загадам розуму – творцу справядлівых законаў” [1, с. 81–82]. Але пра канкрэтныя мерапрыемствы ў гэтай галіне ён гаворыць даволі абстрактна: “ (…) дзяржава павінна стварыць законы, якія перакрыюць усе крыніцы сілкавання злашчаснай раскошы і ўрэшце ліквідуюць яе” [1, с. 86]. Можна дапусціць гіпотэзу пра тое, што А. Волан з’яўляўся прыхільнікам увядзення штрафаў за празмернае выкарыстанне прадметаў дэманстратыўнага спажывання, масавых банкетаў і велічыні пасагу, якія былі апісаны ім на прыкладзе Венецыі [1, с. 77, 84–85].

Рэалізацыя ўсіх адзначаных мерапрыемстваў, накіраваных на рэфармаванне палітыка-прававой сістэмы, ускладалася А. Воланам на дзяржаўныя органы ўлады. Воля да правядзення рэформ звязвалася перадусім з адпаведным узроўнем адукаванасці і маральнай свядомасці прадстаўнікоў улады. У творы “Пра дзяржаўнага мужа і яго асабістыя дабрачыннасці” ўвага звяртаецца на традыцыйныя маральныя якасці, што шырока акцэнтаваліся ў сярэднявечных “павучаннях” манархаў: пабожнасць, справядлівасць і рашучасць у яе адстойванні, мудрасць, шчодрасць, памяркоўнасць, мужнасць [3]. Не меншае значэнне надавалася А. Воланам сцвярджэнню высокіх маральных якасцяў, высокага ўзроўню адукацыі і прафесіяналізму сярод дзяржаўных ураднікаў і суддзяў, адзначалася высокая роля кваліфікаваных юрыстаў у функцыянаванні прававой сістэмы [1, с. 87, 91–92, 95, 97–98]. На аснове гэтага, а таксама на аснове разважанняў пра прыярытэт высакародных якасцяў у вызначэнні шляхецтва можна дапусціць гіпотэзу аб імпліцытным змяшчэнні ў канцэпцыі А. Волана ідэі фарміравання прафесійнай бюракратыі як арыстакратычнага элемента ў дзяржаўнай сістэме.

**Заключэнне.** Такім чынам, у сацыяльна-палітычнай канцэпцыі Андрэя Волана вызначаецца вялікая роля дзяржаўнага права як галоўнага рэгулятара грамадскіх адносін і забеспячэння грамадзянскай свабоды. Сцвярджаецца ідэя аб неабходнасці адпаведнасці дзяржаўнага права натуральнаму розуму. Стаўленне да сучаснай А. Волану палітыка-прававой сістэмы Вялікага Княства Літоўскага і Польскага Каралеўства вызначаецца яе станоўчай акцэнтуацыяй, але разам з тым яно адлюстроўвае крытыку шэрагу яе канкрэтных з’яў. Шлях выкаранення недахопаў існуючай сістэмы бачыўся праз правядзенне адпаведных прававых рэформ дзяржаўнымі органамі ўлады, а таксама павышэнне адукацыйнага і маральнага ўзроўню асоб, якія з’яўляюцца адказнымі за функцыянаванне палітыка-прававога ладу. У канцэпцыі А.Волана яскрава прасочваецца характэрная для рэнесансна-гуманістычнага мыслення дэтэрмінаванасць права мараллю. У межах рэкамендацый адносна шляхоў удасканалення палітыка-прававога ладу можна вылучыць рэкамендацыі па ўдасканаленні агульных асноў прававой сістэмы (забеспячэнне адпаведнасці дзяржаўнага права маральным прынцыпам агульнага дабра і справядлівасці, неабходнасць пастаяннага ўнясення дапаўненняў у заканадаўства ў адпаведнасці са зменамі ў грамадстве, канкрэтызацыя і гуманізацыя права); рэкамендацыі па ўдасканаленні дзяржаўна-палітычнай сістэмы (абмежаванне манархічнай улады, умацаванне інстытутаў “змешанай манархіі”, найперш Сената, стварэнне вышэйшага апеляцыйнага органа судовай улады, складзенага з прадстаўнікоў шляхты і прафесійных юрыстаў); рэкамендацыі па ўдасканаленні міжстанавых адносін (гарантыі строгага выканання прадстаўнікамі ўсіх станаў сваіх сацыяльных функцый, забеспячэнне прынцыпа адноснай роўнасці перад законам прадстаўнікоў усіх станаў); рэкамендацыі па ўдасканаленні канкрэтных прававых норм (забеспячэнне прапарцыйнасці злачынстваў і адпаведных ім пакаранняў, прыняцце строгіх законаў супраць забойстваў, амаральных паводзін, абмежаванне выкарыстання прадметаў раскошы). Характэрна тое, што калі многія праекты рэформ дзяржаўна-палітычнага ладу, прапанаваныя А. Воланам, былі ў далейшым рэалізаваныя на практыцы (абмежаванне манархічнай улады, стварэнне Трыбуналаў Польскага Каралеўства і Вялікага Княтсва Літоўскага), то праекты ўдасканалення міжстанавых адносін і прыняцця законаў, накіраваных супраць раскошы і амаральных паводзін, а таксама законаў, якія б узмацнялі адказнасць за забойства, не дачакаліся здзяйснення ў блізкатэрміновай перспектыве з прычыны пэўнай супярэчнасці іх з інтарэсамі і ладам жыцця пануючага ў Рэчы Паспалітай шляхецкага стану. Фактычная манапалізацыя дзяржаўнай улады магнацкай алігархіяй таксама пакінула нерэалізаванымі планы паступовага фарміравання прафесійнай бюракратычнай эліты.

ЛІТАРАТУРА


1. Волан, А. Аб грамадзянскай, або палітычнай свабодзе / А. Волан ; пер. з лац. У. Шатон. – Мінск : Змицер Колас, 2009. – 142 с.
2. Волан, А. Прамова да Сената Каралеўства Польскага і Вялікага Княства Літоўскага, або Якім павінна быць праўленне дабрачыннага караля / А. Волан // Падокшын, С.А. Беларуская думка ў кантэксце гісторыі і культуры / С.А. Падокшын. – Минск : Беларус. навука, 2003. – С. 174–181.
3. Волян, А. Пра дзяржаўнага мужа і яго асабістыя дабрачыннасці / А. Волян // Спадчына. – 1991. – № 6. – С. 95–104.
4. Jarra, E. Andrew Wolan: Sixteenth Century Polish Calvinist Writer and Philosopher of Law / E. Jarra // Studies in Polish and Comparative Law: a symposium of twelve articles ; with a foreword by H.C. Gutteridge. – London : Stevens & Sons, 1945. – P. 124–155.
5. Kempfi, A. Frycz a Wolan. Zapomniana karta recepcji Frycza w Polsce / A. Kempfi // Andrzej Frycz Modrzewski i problemy kultury polskiego Odrodzenia: praca zbiorowa ; pod red. T. Bieńkowskiego. – Wrocław, Warszawa, Kraków, Gdańsk : PAN, 1974. – S. 203–218.
6. Сокол, С.Ф. Политическая и правовая мысль Белоруссии XVI – первой половины XVII вв. / С.Ф. Сокол. – Минск : Наука и техника, 1984. – 188 с.
7. Сокол, С.Ф. Социологическая и политическая мысль в Белоруссии второй половины XVI века / С.Ф. Сокол. – Минск : Наука и техника, 1974. – 144 с.
8. Падокшын, С.А. Беларуская думка ў кантэксце гісторыі і культуры / С.А. Падокшын. – Минск: Беларус. навука, 2003. – 316 с.
9. Падокшын, С.А. Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі / С.А. Падокшын. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 286 с.
10. Юхо, Я. Трыбунал Вялікага Княства Літоўскага / Я. Юхо // Вялікае Княства Літоўскае : энцыкл. У 3 т. – Мінск : БелЭн, 2005–2010. – Т. 2 : Кадэцкі корпус – Яцкевіч / Рэдкал. : Г.П. Пашкоў [і інш.]. – 2006. – С. 673–674.


*Паступіў 25.09.2015*

## RECOMMENDATIONS FOR IMPROVING THE POLITICAL AND LEGAL SYSTEM IN THE WORKS OF ANDREW VOLAN

***I. BORTNIK. A. EMELIANAY***

*Projects, the recommendations contained in the works of the outstanding representative of social and political thought of the Grand Duchy of Lithuania XVI century Andrew Volan improved existing in the Commonwealth of political and legal system are studied. There is a positive attitude of A. Volan to the contemporary political and legal system of the Grand Duchy of Lithuania and the Polish Kingdom while simultaneously criticizing some of its concrete effects. Way to eradicate the shortcomings of the existing system A. Volan seen through conducting relevant legal reforms, public authorities, as well as improving the educational and moral level of people who are responsible for the functioning of political and legal system. Recommendations which are put forward in the works of A. Volan for improving the general principles of the legal system, the recommendations on improving the state and political system are analyzed.*